# ЛЮДЗІ СТАЛІНСКАЙ ЗАГАРТОЎКІ

Летам 1941 года полчышчы гітлераўскіх бандытаў вераломна напалі на нашу Радзіму. Запалалі гарады і вёскі, ракой палілася народная кроў. Шыбеніцамі і расстраламі акупанты меркавалі прымусіць беларускі народ забыць пра свабоднае і радаснае жыццё, прымусіць яго жыць у няволі, стаць паслухмянымі рабамі.

Але не скарыўся свабодалюбівы беларускі народ. Па закліку партыі бальшавікоў, па зову любімага Сталіна ад малога да вялікага ўзняліся працоўныя Беларусі на свяшчэнную бітву з захопнікамі. На часова акупіраванай зямлі паявіліся шматлікія атрады народных мсціўцаў. Ляцелі пад адхон эшалоны, узрываліся аўтамашыны, партызанская куля чакала акупантаў на кожным кроку.

Дзейнасць беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны атрымала высокую ацэнку. Саратнік вялікага Сталіна, Маршал Совецкага Саюза К. Е. Варашылаў гаварыў: «Беларускі народ з'яўляецца такім народам ленінска-сталінскай эпохі, які ні пры якіх акалічнасцях, нават, калі-б яны былі ў дзесяць разоў больш цяжкімі, чым тыя, якія мы перажылі, не пойдзе ва ўслужэнне да ворага, не схіліць сваёй гордай галавы перад ворагам, а будзе з ім біцца да апошняй кроплі крыві. Гэта ценіць Совецкі Саюз, гэта ценіць наша партыя, гэта ценіць вялікі Сталін».

У летапіс Вялікай Айчыннай вайны залатымі літарамі нямала ўпісана слаўных старонак аб герaічных справах беларускіх партызан. Аб гэтай мужнай барацьбе расказвае кніга Героя Совецкага Саюза В. І. Казлова «Людзі асобага складу»* у літаратурным запісу А. Булакоўскага.

Былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі, камандзір буйнейшага партызанскага злучэння Васілій Іванавіч Казлоў падрабязна расказвае аб зараджэнні партызанскага руху на Беларусі, герaічнай барацьбе народных мсціўцаў, аб кіруючай ролі падпольных бальшавіцкіх арганізацый, аб высокім патрыятызме совецкіх людзей, аб адданасці сваёй сацыялістычнай Радзіме, партыі Леніна — Сталіна.

Чытаеш старонку за старонкай, раздзел за раздзелам, і ў памяці ярка паўстаюць незабыўныя дні.

...3 ліпеня 1941 года. З гістарычнай прамовай па радыё выступіў правадыр совецкага народа І. В. Сталін. «У занятых ворагам раёнах, —гаварыў таварыш Сталін, — трэба ствараць партызанскія атрады, конныя і пешыя, ствараць дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны скрозь і ўсюды, для ўзрыву мастоў, дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, падпальвання лясоў, складаў, абозаў. У захопленых раёнах ствараць няцерпныя ўмовы для ворага і ўсіх яго пасобнікаў, праследаваць і знішчаць іх на кожным кроку, зрываць усе іх мерапрыемствы.

...Усе сілы народа — на разгром ворага!»

Палымяныя сталінскія словы ўзнімалі і натхнялі совецкіх людзей на герaічныя подзвігі ў імя сваёй Радзімы, усялялі веру ў хуткую перамогу над ворагам. Аб тым, як сустрэлі вестку аб прамове таварыша Сталіна сяляне вёскі Забалоцце Акцябрскага раёна, В. Казлоў піша: «...Мы расказалі пра выступленне таварыша Сталіна трэцяга ліпеня, пра рашэнне ЦК КП(б)Б аб разгортванні партызанскага руху на Беларусі. Гэта выклікала незвычайную цікавасць. Мы перадалі змест прамовы даволі падрабязна, аднак адразу заўважылі, што гэтага недастаткова, што людзі яшчэ чагосьці хочуць.

— Можа ў вас гэтая газета ёсць? — пачуўся ўсхваляваны голас.

— Ёсць, — адказаў я, — але-ж цемнавата ўжо, нельга прачытаць.

— Дык хоць так пакажыце нам.

— Я выняў «Праўду», разгарнуў яе і працягнуў людзям. Некалькі рук беражна падхапілі яе, усе заварушыліся, яшчэ шчыльней стоўпіліся і чамусьці перайшлі на шэпт.

— Сталін!.. — вырвалася ў некага з грудзей.

— Здымак Сталіна!.. — усхвалявана прагаварыла адна з жанчын.

—Пакажы, дай сюды... Прачытаць хоць слова... і раптам нехта гучна сказаў:

— Сталін!' Чаго тут шаптацца!... Моцна гаварыце: Сталін! Пайшлі ў сельсовет, запалім агонь і пачытаем!»

З вуснаў у вусны, ад паселішча да паселішча, як на крыллях ляцела вестка аб прамове правадыра. У скупых выразах аўтар здолеў паказаць, як сталінскі заклік аб разгортванні партызанскай вайны ў тылу ворага хутка пранік у самыя народныя гушчы, як падпольныя партыйныя арганізацыі, выконваючы сталінскія ўказанні, раздувалі полымя свяшчэннай барацьбы. І хутка не было такога кутка, раёна, дзе не было-б партызанскіх груп, атрадаў, якія потым аб'ядналіся ў брыгады і злучэнні. Партызанская армія ператварылася ў магутную і грозную сілу, якая наводзіла жах на акупантаў.

Зімой 1942 года партызаны Мінскага злучэння робяць смелы рэйд па тэрыторыі сваёй і суседніх абласцей. Народныя мсціўцы знішчылі дзесяткі варожых гарнізонаў, ачысцілі сотні вёсак ад гітлераўскіх прыслужнікаў. Рэйд меў выключна вялікае значэнне для далейшага разгортвання ўсенароднай барацьбы супраць ворага. «Ён, — адзначае В. І. Казлоў,— сцэментаваў нашу сувязь з масамі, павялічыў наш уплыў на людзей, амаль падвоіў склад нашых атрадаў.

...У выніку рэйда мы фактычна сталі гаспадарамі ў раёнах Мінскай і сумежных абласцей...»

Да жніўня 1942 года ў злучэнні налічвалася каля дзесяці тысяч чалавек, якія ўваходзілі ў шэсцьдзесят сем атрадаў і груп. Акрамя вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў на ўзбраенні злучэння было да двух дзесяткаў гармат. Праз свой аэрадром партызаны мелі рэгулярную сувязь з «Вялікай зямлёй».

*) В. І. Казлоў. Герой Совецкага Саюза. «Людзі асобага складу» Літаратурны запіс Аляксея Кулакоўскага. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1952 г.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы